Спецвыпуск № 1

Лістапад, 2007

ГОРАД НАШ

Грамадская ініцыятыва “За Новыя Смалявічы”

Палякі тут, а тут – бальшавікі.
І горад Слуцк – у паласе нейтральнай.
А па-над гэтай паласой лунае:
- Быць Беларусі вольнай
на вякі!..

І ў бой ідуць яны за родны край,
За ўласныя дзядзінцы ды гасцінцы,
За тое, каб народ увесь чужынцы
Не цягнулі
ў пралетарскі рай.

Алесь Мікалайчанка, “Героям Слуцкага збройнага чыну”.

Да гераічных старонак беларускай гісторы адносіцца Слуцкі збройны чын – адзін з актаў барацьбы супраць Савецкай Расіі за самастойную і незалежную Беларускую Народную Рэспубліку.

СЛУЦКІ ЗБРОЙНЫ ЧЫН 1920 ГОДА

АДРАДЖЭНЬНЕ

Ня гледзячы на шматгадовы нацыянальны і сацыяльны ўціск і вялікія крыўды, што прынесьлі нашай Радзіме Маскоўскія ды польскія акупанты, беларускі народ глыбока ў сваім сэрцы захаваў і праз вякі перанёс нязгасную любоў да свае шматпакутнае Бацькаўшчыны, нястрымныя імкненьні да волі, да незалежнасьці. З-пад саламяных стрэх жывою крыніцаю прабівалася нацыянальная сьведамасьць, якая й парадзіла ў 1917 г. спачатку Нацыянальны Камітэт, потым Раду і нарэшце, Першы Ўсебеларускі Кангрэс. Паўсёйстаронцы шырока разгортваецца творчая, нацыянальна-адраджэнцкая праца: друкуюцца беларускія газэты,часапісы,кніжкі, адчыняюцца беларускія школы,адбываюцца Зьезды розных беларускіх арганізацыяў,утвараюцца беларускія вайсковыя адзьдзелы, а 25 Сакавіка апавяшчаецца векапомны Акт Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Асабліва шырока разгортваецца нацыянальна-адраджэнцкая праца ў Случчыне, дзе арганізаваны Беларускі Нацыянальны Камітэт пад кіраўніцтвам Паўла Жаўрыда адразу згуртаваў наўкола сябе ўвесь нацыянальна-сьведамы актыў Случчыны. Добра разумеючы важнасьць для разьвіцьця Краіны мець уласную інтэлігэнцыю, Случчакі 4 верасьня 1917 г. адчыняюць І-шую Беларускую Гімназію,дырэктарам якой быў Р. Астроўскі.Ды не да смаку ўсё гэта было маскоўскім бальшавіком і 8 сьнежня 1918 г. іхныя орды зьяўляюцца на нашай зямлі. Пачынаецца вынішчэньне ўсяго нацыянальна-каштоўнага. Беларускія арганізацыі і ўстановы закрываюцца, найлепшыя людзі арыштоўваюцца і высылаюцца на вынішчэньне. Павал Жаўрыд, які ня выехаў із Случчыны, арыштоўваецца і вывозіцца з



Беларусі. Беларуская Рада і Ўрад, своечасова выехаўшы з Менску,працуюць у Горадні і Вільні. Па ўсёй Беларусі, у адказ на маскоўска-бальшавіцкі прыгнёт, пракацілася шэраг паўстаньняў: Вяліжскае, Парэцкае, Іванецкае, Койданаўскае, Панькоўска-Будзкае, Бешанкавіцкае. Праведзеная Маскоўскім акупантам прымусовая мабілізацыя больш узмацавала паўстанскі вызвольны рух. Вясной 1919 г. Слуцкі Сводны Батальён пад кіраўніцтвам беларускіх ахвіцэраў выступіў супроць накінутае Масквою Савецкае ўлады. Змаганьне трывала некалькі дзён, пакуль бальшавікі ня выклікалі з Менску 3-ці полк Ч.-К. У сакавіку 20-ты Пагран. полк у Рагачове забіў свайго камісара Цымермана. У красавіку паўстаў 2-гі Беларускі Палескі полк. У час Барысаўскага паўстаньня, мяйсцовы Батальён перайшоў на бок паўстанцаў. У час Гомельскага паўстаньня, батальён, што стаяў

у Гомелі, адмовіўся абараняць Гомельскі Рэв. Камітэт, які і быў зьнішчаны паўстанцамі. Роўна цераз паўгода 8 чэрвеня 1919 г. Маскоўскі акупант вымушаны быў пакінуць нашыя землі, а на яго мейсца зьявіўся новы акупант -- палякі. З вялікімі цяжкасьцямі даводзіцца разгортваць нацыянальную працу зноў арганізаванаму Беларускаму Камітэту Случчыны на чале якога стаў лекар Паўлюкевіч. Выканаўчы Камітэт складаўся з 3-х чалавек: Паўлюкевіча, Бочко і яшчэ аднаго.

Але 11 ліпеня 1920 г. Маскоўска-бальшавіцкія орды зноў зьяўляюцца на Беларусь і коцяцца далей аж да Варшавы. Аднак, пасьля няўдалага паходу на Варшаву, разьбітыя пры дапамозе беларускіх частак Булак Балаховіча палякамі, хутка коцяцца назад і спыняюцца за р. Вясеяй каля Кандратовічаў. Паміж бальшавіцкаю Масквою і панскаю Польшчаю адбываюцца гэтак званыя "мірныя перамовы". Розныя чуткі моцна хвалююць Случчакоў. Інтэлігенцыя, моладзь, ахвіцэрства, (а трэба зазначыць, што ў гэты час на Случчыне было больш за 300 ахвіцэраў усіх радоў зброі і рангаў), усхвалявана хапаліся за кожную навіну, запаўнялі базарную плошчу, выказвалі рашучасьць у змаганьні супроць любога акупанта. Перамовы бальшавіцкае Масквы з Польшчаю закончыліся падпісаньнем Рыскага Трактату, па якому, ня пытаючыся згоды беларускага народу, жывое цела Беларусі парвалі на часткі. Прадстаўнікі Польшчы й Масквы (Домбскі й Іофэ), гэтак былі задаволены падзелам нашае Бацькаўшчыны, што, падпісаўшы Рыскі Трактат, аж пацалаваліся.

(Паводле Рыскай мірнай дамовы, падпісанай 12 кастрычніка 1920 паміж Польшчай, РСФСР і УССР, усталёўваліся новыя дзяржаўныя межы, якія дзялілі Беларусь і Ўкраіну на дзьве часткі. Беларуская дэлегацыя ўвогуле ня была запрошаная на перамовы - ані ад Беларускай Народнай Рэспублікі, ані ад марыянэткавай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь. Водле дамовы, дэмаркацыйая лінія Кіевічы-Лань ішла такім чынам, што раён вакол Слуцку на пэўны час апыноўваўся ў нэўтральнай зоне перад тым, каб быць занятым Чырвонай арміяй

...Але
ўжо ня згодны беларус гнуць сьпіну
Досыць працярпеўён шмат гадоў палон;
Паўстае ён сьмела за сваю Краіну,
За абліты потам дарагі загон...



Павал Якаўлевіч Жаўрыд (1889-1939) - беларускі палітычны дзеяч.

Вестка аб няпраўным падзеле Беларусі выклікала нязвычайнае абурэньне беларускага народу, асабліва вольналюбных Случчакоў. Слуцкі Беларускі Камітэт разгортвае гарачую працу па арганізацыі самааховы. Набіраецца 500 чалавек Народнай міліцыі, якая ў будучыні мае ператварыцца ў зародак Беларускага войска... Случчакі добра разумелі, што толькі збройнаю сілаю можна здабыць незалежнасьць. Палякі, якія ў хуткім часе меліся адыйсьці за р. Лань, не перашкаджалі гэтай справе, нават, спачувалі, асабліва абшарнікі, якія мелі свае двары ў Случчыне. Вельмі добра разумеючы вялікую гістарычную важнасьць данага адрэзку часу ды адказнасьць за ахвяры крывавага змаганьня Слуцкі Беларускі Камітэт склікае Зьезд Случчыны, каб сам народ вырашыў свой лёс.

ЗЬЕЗД СЛУЧЧЫНЫ

14 лістапада 1920 г. у Слуцку ў вялікай залі будынку Вайніловічаў адбыўся І-шы Зьезд Случчыны, у якім бралі удзел 107 дэлегатаў ад м. Слуцка і 15 валасьцей ды некалькі прадстаўнікоў ад беларускіх частак Булак Балаховіча. Вялікая заля была хутка напоўнена "кажухамі" і "шынелямі", як трапна заўважыў адзін з удзельнікаў Зьезду. За Старшыню Зьезду быў абраны Васіль Русак, за Віцэ-Старшыню -- адвакат Уладзімер Пракулевіч. Пасьля адчыненьня Зьезду і прывітаньня дэлегатаў, на трыбуну, прыбраную бел-чырвона-белымі сьцяжкамі і зелянінай, узыйшоў Павал Жаўрыд, дастаў з кішэні мандат і апавясьціў, што ён, Павал Жаўрыд, прыехаў па даручэньню Ўраду БНР, якім прызначаны Камісарам на Случчыну. Гучныя воплескі былі адказам прысутных. На Зьездзе выступалі з прамовамі: В. Русак, кап. Анцыповіч, кап. Самусевіч, Юльян Сасноўскі, Рыгор Грынько, Уладзімер Пракулевіч, Іван Біруковіч, Павал Бань, Аляксей Кабычкін, кап. Сокал-ш. Кутылоўскі, Юрка Лістапад і інш. Вельмі добрую прамову сказаў настаўнік Наронскі. Прамовы былі кароткія, але палкія і рашучыя.Пастанова змагацца супроць усялякае чужацкае ўлады была прынятая аднагалосна. З-за нястачы часу Зьезд закончыўся ў адзін дзень. Кіраўніцтва збройным змаганьнем Зьезд даручыў абранай

Радзе Случчыны ў якую ўвайшлі Уладз. Пракулевіч (Старшыня), Васіль Русак, Радзюк, Мяшочак, Павал Жаўрыд, Юрка Лістапад, Юльян Сасноўскі, лекар А. Паўлюкевіч, Бусел, Дубіна, Іван Біруковіч, Аляксей Кабычкін, Рыгор Грынько, кап. Анцыповіч, Павал Бань і інш., усяго 17 чалавек. Зьезд прыняў рэзалюцыю: "І-шы Беларускі Зьезд Случчыны, скліканы ў ліку 107 асобаў, вітае Найвышэйшую Раду Беларускай Народнай Рэспублікі і заяўляе, што ўсе свае сілы аддасьць на адбудову Бацькаўшчыны, катэгарычна пратэстуе супроць заняцьця нашай Бацькаўшчыны чужацкімі і самазванчымі савецкімі ўладамі. Хай жыве вольная незалежная Народная Беларуская Рэспубліка ў яе этнаграфічных межах!" І зараз-жа пачалася падрыхтоўка да збройнага змаганьня. У гэты-ж самы вечар частка дэлегатаў выехала на вёскі ў воласьці: Грозаўскую, Грэскую, Цараўскую, Раманаўскую, Чапліцкую, Быстрыцкую, Старобінскую, Вызьненскую, Капыльскую, Цімкавіцкую і ін Уся міліцыя з вёсак была сьцягнена ў Слуцак. Ачоліць вайсковыя сілы запрапанавалі кап. Паверзаку. -- "Вас мала",-- адмовіўся ён. агды камандаваньне батальёнам беларускай міліцыі было даручана кап. Антыповічу. (Жыхар вёскі Працавічы,

Тбылы фельдфебель царскай арміі, які даслужыўся ў час І-й Сусьветнай вайны да ахвіцэрскага чыну штабс-капітана). 21 лістападу 1920 г. Рада Случчыны выдае дэклярацыю: “У момант самаазначэньня ўсіх народаў і змаганьня іх за сваю санастойнасьць і свабоду Беларуская Рада Случчыны выконвае волю сялянства, паслаўшага яе і даверыўшага ёй абарону незалежнасьці нашае бацькаўшчыны Беларусі, заяўляе ўсяму сьвету аб дамаганьнях-намерах беларускага сялянства аб тым, што Беларусь павінна быць вольнай незалежнай рэспублікай у яе этнаграфічных межах. Абвяшчаючы аб гэтым і, зьяўляючыся выразіцелкай волі народу, Слуцкая Рада дэкляруе цьвёрда стаяць за незалежнасьць роднай Беларусі і бараніць інтарэсы сялянства ад гвалту збоку чужаземных захопнікаў і ў выпадку патрэбы, нават, сілаю аружжа, нягледзячы на лічбовую перавагу ворага, думаючы, што наша справа -- справа праўдзівая, а праўда заўсёды закрасуе.”

М І Т Ы Н Г

І заварушылася ўся Случчына. Па ўсіх вёсках утвараюцца Нацыянальныя Камітэты Дапамогі Радзе ў падрыхтоўцы збройнага змаганьня. Вайсковае Камандаваньне пры Слуцкай Радзе, добра разумеючы, што за гэтакі кароткі час арганізаваць з неабучаных добраахвотнікаў абарону Слуцка немагчыма, тым больш, што вораг знаходзіўся ў 10 кілямэтрах ад Слуцка, выдае загад выступіць усім вайсковым часткам і міліцыі ў кірунку Семежава, дзе і сабрацца 24 лістапада. У Слуцку на Базарнай плошчы адбываецца мітынг, на якім прамаўлялі Старшыня Рады Пракулевіч, сябра Рады Ю. Лістапад і яшчэ некалькі вайскоўцаў. Асабліва памятна прамова падпалк. Гаўрыловіча. “Браты-Беларусы! Я не красамоўца. Я -- франтавік. Ваяваў супроць немцаў. Потым... супроць чырвоных маскалёў... Прачуў я, што вам пагражаюць з Масквы бальшавікі. Пакінуў белых... Прабіраўся цераз франты...Сьпяшаў да свайго народу. Часта нараджаўся на сьмерць... Але Бог сцярог... І я з вамі. Я маю веды... веды камандзіра-франтавіка... Хачу іх перадаць для абароны свае Бацькаўшчыны. Гэта -- мой абавязак... Я кончыў. Запісвайцеся ў добраахвотнікі. Хто ў войска -- падыходзь да гэтага століка, хто ў Чырвоны Крыж -- да таго.” І захвалявалася плошча:

--Пішы мяне...

-- Мяне пішы...

Лезьлі адзін цераз другога, стараючыся запісацца першым. Я антылярысты... разумею гарматы,-- крычаў высокі сухарлявы дзед, распіхаючы локцямі натоўп... Вось і каля століка. -- Пішы ў антылерыю... -- Ды дзе табе? -- адгаварваў пісар. -- Хопіць малодшых. Але дзед ня ўнімаўся, пакуль не запісалі ў вабоз... -- Калі ня здоляю быць пры гармаце, то хоць амуніцу спрытней за маладога падвязу,-- бурчэў задаволены дзед. Разам з дзедам ішоў і 16-ці гадовы юнак. Бацька й старэйшыя браты былі на Румынскім фроньце ў 4-м Корпусе... (Зьвязны ад Ураду Б.Н.Р. кап. Манцэвіч ніяк ня мог дабіцца ад Расейскага камандаваньня адпраўкі беларускіх частак на Бацькаўшчыну. Корпус пад камандаваньнем гэнэрал-маёра Пажарскага складаўся з 3-х пяхотных дывізыяў і 6-га коннага палка). Дзяўчаты запісваліся ў Чырвоны Крыж, жанчыны -- у швэйную майстроўню, зьбіралі палотны, шылі для жаўнераў бялізну, сарочкі, а з тонкага кужалю рабілі бінты. Зараз-жа ўтвараюцца зьвязы, дружыны, вызначаюцца камандзіры, якім выдаецца загад накіравацца ў Семежава. Гэта быў І-шы Слуцкі Полк, камандаваньне якім было даручана падпалк. Гаўрыловічу. На 2-гі дзень Грозаўцы прыслалі сваіх добраахвотнікаў проста ў Семежава, дзе і ўтвараецца 2-гі Беларускі Грозаўскі Полк пад камандаю кап. Семянюка. У гэтым палку было шмат казакоў. З двух палкоў была ўтворана Слуцкая Брыгада, пад камандай кап. Анцыповіча. Вайсковая Камісія пры Ўрадзе Б.Н.Р. з Горадні накіравала для помачы Случчакам добра асьвечаных вайскавікоў: маёра Якубецкага, кап. Клюка і кап. Борыка. Дзякуючы прысутнасьці дасьведчаных ахвіцэраў, нармальная праца ў штабе Брыгады была хутка і добра наладжаная. Лекар Паўлюкевіч зарганізаваў узорны Палявы Шпіталь, Я. Бірукові́ч -- Вайсковы Суд.

П А С Е Д Ж А Н Ь Н Е

Усяго ў Семежаве сабралася каля 10-ці тысяч адважных патрыётаў, барацьбітоў за незалежнасьць Беларускае Краіны. Адбылося паседжаньне Слуцкай Рады, дзе дэталёва абмяркоўвалася пытаньне аб’еднаньня з арміяй Булак-Балаховіча. Дохтар Паўлюкевіч зацята выступіў за аб’еднаньне з Балаховічам, які быў зьвязаны з Польскімі Вайсковымі угамі. Уладз. Пракулевіч і Жаўрыд запрапанавалі, нават, навязаць перамовы з Чырвонаю Масквою, але іншыя радныя, асабліва прадстаўнікі сялянства, Юрка Лістапад, Юльян Сасноўскі, Васіль Русак, Бусел і Дубіна рэзка выступілі супроць і аднае і другое прапаноў, і Слуцкая Рада ўхваліла змагацца і далей пад сьцягам Б.Н.Р., грунтуючыся на Акту 25 САКАВІКА.

С Ь Ц Я Г

Сьцяг І-га Слуцкага Палка быў залацістага колеру, 2 мэтры ў даўжыню і 1 мэтар ушыркі, пасярод, дыямэтрам 45 см, Пагоня, а навакол



-- надпіс: Першы Слуцкі Полк Беларускай Народнай Рэспублікі.

1921 г. Сцяг 1-га Слуцкага палка войскаў Беларускае Народнае Рэспублікі. Злева - Лявон Вітан-Дубейкаўскі, справа - Антон Сокал-Кутылоўскі. На звароце сцяга надпіс: “Тым, што пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына”. Сцяг вышыты беларускімі жанчынамі ў Горадні.

ЗА БАЦЬКАЎШЧЫНУ

27 лістапада 1920 г. Слуцкая Брыгада адважна кінулася ў крывавую бойку супроць 16 Савецкай арміі. Няроўная была барацьба. Без гарматаў, кулямётаў Случчакі зацята змагаліся. Глыбокая вера ў праваты свае справы прыдавала палкім змагаром столькі сілы, што яны ня толькі спынілі бальшавіцкі наступ, але й самі, пачалі пераходзіць у контр атакі ды, перамагаючы ворага, аслабанялі вёскі й мястэчкі. Баі разгортваліся каля вёсак: Быстрыцы, Васільчыцы, Верабейчыцы, Дашкава, Васілішкі, Лютавічы, Мацкевічы, Садовічы,

Морач а таксама каля мястэчак Копыля, Цімкавіч і Вызны. Баі былі ўпартыя, часта пераходзілі ў багнэты. Цімкавічы і некаторыя вёскі па некалькі разоў пераходзілі з рук у рукі. Случчакі занялі Грозаў, Цімкавічы, Раманаў і наступалі на Старобін. У гэты час камандаваньне Слуцкай Брыгадай перайшло ад кап. Анцыповіча, які быў надта добры выканаўца, але мала ініцыятыўны, да кап. Чайкі. Апошні аказаўся здраднікам і перайшоў да чырвоных. 3-га сьнежня 1920 г. камандаваньне Слуцкай Брыгадай пераняў кап. Сокал-Кутылоўскі, камандзір цьвёрдай волі, энергічны і ініцыятыўны.

Баі працягваліся. У баёх адзначыўся падпалк. Гаўрыловіч, а таксама неўлавімы паручык Міpановіч, вылазкі якога ў тыл ворага насілі легэндарны характар. Супроць чырвоных напасьнікаў па ўсёй Случчыне разгортваецца бязьлітасная партызанская барацьба. Шэрагі паўстанцаў павялічваюцца з кожным днём, але змаганьне ня роўнае. Рада Случчыны выдае адозву, заклікаючы ворага пераходзіць на бок Случчакоў. Шмат хто з чырвонага войска былі незадаволены бальшавіцкаю палітыкаю, здаваліся ў палон, а некаторыя далучаліся да Случчакоў. Тагды Маскоўска-бальшавіцкі Ўрад накіроўвае супроць Случчакоў вялікія камуністычныя адзьдзелы латышоў і кітайцаў. Агнём і крывёю азначылі яны свой шлях: палілі вёскі, рабавалі, растрэльвалі старых і малых. Гінуць Случчакі, але гінуць і чырвоныя янычары. Загінуў у Мікалаеўскіх хутарох і карны бальшавіцкі адзьдзел разам з камісарам Цыганковым. У сваіх успамінах аб Слуцкім Паўстаньні адзін з удзельнікаў яго (А. Кабычкін) піша: "Мне давялося быць сьведкай збройнай барацьбы розных партызанскіх адзьдзелаў на Ўкраіне, але нідзе я ня бачыў гэтакага запалу, як у Слуцкіх Паўстанцаў. Гэта была, бадай, адзіная ў сьвеце вайсковая фармацыя, якая нічога ня брала ў насельніцтва і не рабіла ніякіх рэквізыцыяў. Зрэшты ў гэтым ня было й патрэбы, бо ўсё патрэбнае для войска, як фураж, прадукты, а нават вопратку сяляне самі добраахвотна прывозілі ў Семежава... Трэба было бачыць, як, амаль штодня, цягнуліся абозы ў Семежава (часта з бел-чырвона-белым сьцягам на першым возе), з усім патрэбным для паўстанцаў, каб належна зразумець, зь якой любоўю і ахвярнасьцю адносілася насельніцтва да свайго вызвольнага войска. Але сілы былі няроўныя і 31 сьнежня, заліваючыся крывёю, Слуцкая Брыгада вымушана была перайсьці за р. Лань, дзе і была разброена палякамі.

ЗЯЛЁНАЯ АРМІЯ

Некаторыя з жаўнераў Случчакоў не захацелі здаць зброі і вярнуўшыся назад у Слуцкія лясы, дзе, творачы Зялёную Армію, доўга змагаліся супроць камуна-расейскіх акупантаў. Асабліва адзначаліся партызанскія групы з Палесься, ад Мозыра да Мікашэвічаў. Кап. Самусевіч, паручыкі Гапановіч, Міpановіч, Коршун, Сарока, Грач і інш., маючы штаб-кватэру ў Несьвіжы доўгі час не давалі спакойна спаць чырвоным камісарам. Да 1937 г. актыўна дзейнічае атаман з-пад Слуцку Якуб Трухан. У 1930 г. пробуе арганізаваць паўстаньне кам. роты П. Люцко. Адзьдзел атамана Сагалевіча, паўсталы яшчэ з 1917 году, заснаваўся ў трыкутніку вёсак Кузьмічы -- Нежын -- Кутынка (24 кл. ад Любані) налічваў 2400 жаўнераў, з рознаякаснай зброяй і аж да 1927 г. змагаўся супроць чырвоных захопнікаў, утвараючы наўкола сябе дыямэтрам 40-50 клм. Незалежную Партызанскую Рэспубліку. Адзьдзел атамана Цішкі (18 ваякаў з групы Багалёўцаў) дзейнічаў недалёка воз. Князь у балотах Камар-Мох аж да 1934 г. Гэта быў легэндарны няўлавімы атаман, ад імя якога дрыжэлі бальшавіцкія камісары ў Слуцку. Частка Случчакоў, як Юры Лістапад, перайшлі да іншых мэтадаў змаганьня і зьявіліся зародкам нацдэмаўшчыны.

ВЕЧНАЯ СЛАВА

Кап. Анцыповіч неафіцыйна выдадзены палякамі Саветам, пасьля катаваньня -- растрэляны. Кап. Самусевіч папаўся ў Менскае Ч-К, дзе і быў закатаваны. Пар. Бранявіцкі забіты падасланымі ў Польшчу агентамі НКВД. Пар-кі Кернажыцкі, Коршун, Янушэнка арыштаваны агентамі НКВД у 1939 г., высланы ў Сібір на цяжкія прымус. працы, дзе і загінулі. Калечыц быў схоплены сав. агентамі ўзімку 1921 г. на базарнай плошчы ў Стоўпцах, укінуты ў сані і хутка вывезены ў кірунку савецкай граніцы. Юльян Сасноўскі, актыўны сябра Слуцкай Рады, ня вытрымаў зьдзекаў польскай адміністрацыі і пакончыў самагубствам.

Пар-кі Багушэвіч, Гапановіч, палк. Гаўрыловіч, Жаўрыд, Пракулевіч, паверыўшы Савецкай амнэстыі, вярнуліся дадому, дзе й загінулі ад рук чырвоных катаў. Кам. Слуцкай Брыгады Сокал-Кутылоўскі пасьля ІІ-й Сусьветнай вайны быў выдадзены на зьдзекі ў лапы чырвоных маскалёў. А колькі іх ведамых і няведамых закатавана Маскоўска-бальшавіцкімі ды іншымі акупантамі. Вечная памяць тым, што пайшлі паміраць, каб жыла Бацькаўшчына.

Пасьля нацыянальнага адраджэньня ў Беларусі ў 1980-х гг. 27 лістапада адзначаецца пэўнай часткай беларускага грамадзтва як Дзень Герояў. Афіцыйная ўлада ігнаруе антыбальшавісцкае паўстаньне, гэтаксама як і ўсё зьвязанае зь Беларускай Народнай Рэспублікай.

Ведай сваю гісторыю!!!



На здымку: Эдвард Вайніловіч, фундатар Чырвонага касцелу ў Менску. У доме якога ў 1920 г. 14 лістапада адбыўся І з'езд Случчыны.

Горад Наш

Галоўны рэдактар *Яўген Смалявіцкі*

Мастацкі рэдактар *Надзея Лёс*

Выдавец і заснавальнік
Грамадзкая ініцыятыва "За Новыя Смалявічы"

Адваротная сувязь
jauhien.p@gmail.com

Тыраж *299 асобкаў*

Распаўсюджваецца *Бясплатна*